**Л.А.Дзямешка,** *прафесар*
**С.А.Паўлава,** *дацэнт*

# ВЫХАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН

Праграма развіцця Рэспублікі Беларусь грунтуецца на дзяржаўнай ідэалогіі, якая вызначае важнейшыя ідэалы грамадства, мэты і перспектывы, кансалідуе народ. Асновай ідэалогіі справядліва лічаць патрыятызм і нацыянальную самасвядомасць – сукупнасць уяўленняў, пачуццяў і ведаў чалавека аб сваёй прыналежнасці да Радзімы, да пэўнай нацыі. Патрыятызм цесна звязаны з нацыянальнай самасвядомасцю. Яны прадвызначаюаць асэнсаванне агульнасці інтарэсаў людзей, павагу да гістарычнага мінулага свайго народа, гонар за яе дасягненні, горыч за няўдачы і памылкі продкаў і сучаснікаў, актыўную пазіцыю па стварэнні новага, прагрэсіўнага. Сапраўдны патрыятызм характарызуе павага да іншых народаў, іх культуры, гісторыі.

Нацыянальная самасвядомасць выключае як нацыянальны нігілізм, так і квазіпатрыятызм – гіпертрафіраванае ўяўленне аб сваёй нацыі. З ёю несумяшчальныя сепаратызм, нацыяналізм, шавінізм.

У складаным і шматбаковым працэсе выхавання патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці значную ролю выконваюць выкладчыкі, якія ў працэсе навучання вырашаюць не толькі адукацыйныя, але і выхаваўчыя задачы. Гэтаму садзейнічае сістэмна-культурны падыход, адлюстраваны ў вучэбным плане факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. У цыкл агульнанавуковых дысцыплін уведзена новая дысцыпліна "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы". Гэтая дысцыпліна не толькі аказвае ўплыў на характар, структуру і ідэйнае напаўнен-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не вучэбнай работы, але яна стала фактарам, які выводзіць на новы ўзровень ідэалагічную і выхаваўчую работу.

Садзейнічае выхаванню патрыятызму і спецкурс “Вялікая Айчынная вайна беларускага народа”. Такім чынам, замацаванне патрыятычных пачуццяў, паскарэнне росту нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў пачынаюцца на этапе засваення зместу агульнаадукацыйных дысцыплін і больш актыўна працягваюцца ў цыкле спецыяльных дысцыплін: “Абслугоўванне чытачоў”, “Чытачазнаўства”, “Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент”, “Бібліятэка і вольны час”, “Паблік рылейшнз”, “Абслугоўванне чытачоў па краязнаўстве”, “Дзіцячае чытачазнаўства” і інш.

Важнейшым, на наш погляд, з’яўляецца азнаямленне выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін са зместам агульных курсаў і характарам тых ведаў, якія атрымліваюць студэнты. Сістэматычная праверка ведаў па спецдысцыплінах выяўляе назапашаныя студэнтамі веды па агульнаадукацыйных прадметах. Напрыклад, інтэграваны характар “Абслугоўванне чытачоў” дазваляе пастаянна абнаўляць веды па філасофіі, гісторыі, сацыялогіі, педагогіцы, літаратуры, мове і іншых прадметах.

У змест названага курса ўнесены новыя тэмы, якія сведчаць аб пераглядзе метадалагічных асноў дысцыпліны, а менавіта: “Роля кнігі і бібліятэкі ў сацыялізацыі асобы”, “Маральнае, патрыятычнае, працоўнае выхаванне сродкамі бібліятэкі”. У раздзеле “Вывучэнне чытача і чытання” і ў курсе “Чытачазнаўства” значная ўвага надаецца тэме Вялікай Айчыннай вайны. Чатыры цяжкія гады акупацыі, якія выпалі на долю беларускага народа, сталі трагедыяй для ўсёй рэспублікі, для кожнай сям’і, кожнага чалавека асобна. Стан СССР у цяжкія гады акупацыі, прыклады гераізму байцоў і работнікаў тылу, подзвігі партызан, падпольшчыкаў, вялікая напружаная работа выдавецтваў па перабудове работы ва ўмовах ваеннага часу, аналіз формаў і метадаў распаўсюджання твораў друку сярод партызан і падпольшчыкаў, уплыў праўдзівага слова на размах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

партызанскага руху – усе гэтыя пытанні самі па сабе не пакідаюць студэнтаў раўнадушнымі, вымушаюць задумвацца над лёсам сваёй Радзімы і свайго народа.

Даволі эфектыўным з'яўляецца комплекснае выкарыстанне актыўных метадаў навучання, якія арыентуюць студэнтаў на індывідуальнае выкананне заданняў, даюць магчымасць навучыць іх шукаць і знаходзіць калектыўныя рашэнні. Выкарыстанне элементаў дзелавых гульняў, самі гульні, рознага характару мерапрыемствы спрыяюць фарміраванню патрыятычных пачуццяў студэнтаў. І ў гэтым плане ўжо назапашаны пэўны вопыт у арганізацыі і правядзенні комплексных масавых мерапрыемстваў, прысвечаных патрыятычнай тэматыцы.

Комплексны характар метадычных мерапрыемстваў навучання па фарміраванні патрыятычных пачуццяў прадугледжвае разам з тым вылучэнне асноўных метадычных формаў. На наш погляд, найбольш значным у гэтым плане з'яўляецца выкарыстанне выкладчыкам сістэмы метадычных указанняў па структуры вучэбнай дзейнасці і самастойнай рабоце, а таксама арганізацыя сітуацый па сумесным вырашэнні прадуктыўных заданняў з наступным калектыўным абмеркаваннем.

У працэсе выкладання бібліятэказнаўчых дысцыплін паступова вырашаюцца пэўныя задачы, якія спрыяюць выхаванню ў студэнтаў патрыятызму і фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Гэта наступныя задачы:

– выяўленне элементаў зацікаўленасці, унутранай падрыхтаванасці да выкарыстання беларускай мовы ў практычнай дзейнасці і быце;

– вызначэнне асабістых інтарэсаў студэнтаў да пошуку, вывучэння і сістэматызацыі матэрыялаў аб культуры, гісторыі, традыцыях краю шляхам самастойнага выбару розных варыянтаў вучэбных заданняў, прапанаваных праграмай адпаведнага курса;

– вызначэнне кірункаў самастойна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у кантэксце пастаўленай праблемы (з дапамогай

пакета метадычных матэрыялаў, што ўключаюць методыку пошуку, структуравання дакументаў, распрацоўку заданняў, пералік бібліятэчных, інфармацыйна-тэхнічных сродкаў і інш.).

Задачы вырашаюцца шляхам як аўдыторнай так і пазааўдыторнай работы. Добры вынік дае пазааўдыторная работа. Яна скіравана на выяву індывідуальных схільнасцей студэнтаў, іх інтарэсаў, зацікаўленасці, здольнасцей і ўключае, акрамя іншага, выкананне дамашніх заданняў творчага характару: распрацоўку сцэнарыяў, мастацкае афармленне выстаў, мантаж літаратурнага матэрыялу, а таксама навукова-даследчую работу (пошук і аналіз крыніц краязнаўчага характару, падрыхтоўку да навуковых канферэнцый, напісання навуковых прац). Пазааўдыторная работа прадугледжвае і практычную дзейнасць (правядзенне падрыхтаваных самастой-на мерапрыемстваў, удзел у бібліятэчных мерапрыемствах і інш.). Так, студэнты прынялі актыўны ўдзел у літаратурна-музычнай імпрэзе, прысвечанай Міжнароднаму дню роднай мовы, якую ладзіла Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Беларусь (люты, 2005 г.); у афармленні разгорнутай выставы "Тых дзён вялікіх не забыты раны" з раздзеламі "Незабыўны дзень вызвалення", "Ах, ветэраны, ветэраны, вы – гонар роднае зямлі", "Стаяць маўкліва абеліскі з імёнамі і без імён", "Вуліцы помняць", "Вайна ў творах пісьменнікаў-землякоў" (Мінская цэнтральная бібліятэка імя Я.Купалы); разгорнутай выставы "Мы – беларусы" з раздзеламі "Адкуль наш род", "Вобразы мілыя роднага краю", "Мінск – наша сталіца" (бібліятэка-філіял №6 ЦБС г.Мінска); падрыхтоўцы выставы "У падарожжы па гісторыі" (Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя М.Астроўскага г.Мінска); цыкла мерапрыемстваў пад агульнай назвай "Мая краіна – Беларусь" (бібліятэка-філіял №2 г.Мінска) і інш.

На сучасным этапеназіраецца цікавасць грамадства да мінулага Айчыны, беларускай гісторыі, культуры, да сваіх каранёў. Расце прэстыж краязнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З мэтай павышэння ролі бібліятэк у адраджэнні, захаванні і распаўсюджанні нацыянальнай культуры Міністэрства культуры сумесна з Беларускім фондам культуры штогод праводзіць рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”, вынікі якога друкуюцца на старонках часопіса “Бібліятэчны свет”.

У вучэбным плане факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў ёсць курс “Бібліятэчнае абслугоўванне чытачоў па краязнаўстве”. Асабліва спрыяльны матэрыял для выхавання нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў уяўляе тэма “Групавое і франтальнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк дакументамі краязнаўчай тэматыкі”. У межах тэмы студэнты працуюць з першаснымі і другаснымі дакументнымі патокамі, вядуць пошукавую работу па вывучэнні роднага краю, атрыманні новых звестак аб ім. Практычнымі заданнямі з’яўляюцца распрацоўкі альбомаў-летапісаў гісторыі свайго краю, картатэк-хронік падзей краю, вечарын “Наша мінуўшчына”, арганізацыя кансультацый на тэму “Твой радавод”, вандровак па родных мясцінах. Аб усведамленні сябе прадстаўнікамі самабытнага беларускага народа сведчаць з вялікай зацікаўленасцю распрацаваныя студэнтамі картатэкі “Славутыя людзі, якіх дала свету Беларусь”, “Мае землякі ў Вялікай Айчыннай вайне”, падарожжы па родным краі. Лепшыя распрацоўкі студэнтаў публікуюцца на старонках газеты “Наша слова” пад рубрыкай “Малая радзіма вачыма студэнтаў”. Так, немагчыма без хвалявання чытаць сапраўды мастацкія артыкулы Алены Каржанеўскай “Па дарогах Случчыны” (“Наша слова”, 2004 год, 28 красавіка), Вольгі Семяніды аб Міёрскім краі “Тут прайшло маё дзяцінства” (“Наша слова”, 2004 год, 18 мая) і іншых студэнтаў.

У выніку практычных заняткаў студэнты авалодваюць не толькі тэарэтычнымі, метадычнымі і арганізацыйнымі асновамі краязнаўчай дзейнасці ва ўмовах бібліятэкі, але і ўсведамляюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

непарыўную сувязь з роднай зямлёй, самабытнасць сваёй культуры, асаблівасці нацыянальнага характару, менталітэту.

У праграме курса "Бібліятэка і вольны час" вызначана тэма "Сістэма сродкаў (формаў і метадаў) арганізацыі вольнага часу карыстальнікаў бібліятэк", у межах якой прадугледжаны практычныя заняткі па распрацоўцы мэтавых праектаў, праграм аматарскіх чытацкіх аб'яднанняў, літаратурных гасцёўняў, сцэнарыяў і інш. Студэнтам прапануюцца для распрацоўкі наступныя мерапрыемствы: "Мовы беларускае алмаз" (літаратурная гасцёўня, прысвечаная творчасці беларускіх пісьменнікаў-класікаў), "Выток" (літаратурна-паэтычны клуб), "Мове роднай пакланіся" (праграма і сцэнарый музычна-фальклорнага свята), "Цудоўныя казачнікі" (вандроўка па казках беларускіх пісьменнікаў Я.Коласа, У.Дубоўкі, А.Якімовіча, У.Караткевіча, В.Іпатавай) і інш.

Студэнты факультэта завочнага навучання распрацавалі цікавыя матэрыялы па такіх тэмах: "Шлях Ефрасінні" (прадстаўленне на адкрыцці Дзён беларускага пісьменства), "Старажытны Магілёў" (вандроўка), "Вянок Дрыбіншчыны" (клуб творчых сустрэч), "Галасы роднага краю" (літаратурная сустрэча, у якой, дарэчы, прыняў удзел вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Федасеенка, у мінулым выпускнік нашага факультэта) і інш.

Гэтыя матэрыялы выкарыстоўваюцца выкладчыкамі ў якасці ўзораў для студэнтаў стацыянара. Самастойнай распрацоўкай такіх мерапрыемстваў, стварэннем мэтавых праграм і праектаў, прэзентацыйных матэрыялаў з дапамогай "Power Point" студэнты не толькі спасцігаюць новыя інфармацыйныя і сацыяльныя тэхналогіі, але і дэманструюць асабістыя якасці – нацыянальны гонар, любоў да культуры, да мовы, да сваёй Радзімы.

Лічым, што ўсе віды заняткаў па бібліятэказнаўчых дысцыплінах могуць стаць адным са сродкаў выхавання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў. У працэсе выкладання курсаў магчыма:

– выклікаць цікавасць студэнтаў да пэўнай тэмы, праблемы, жаданне вывучаць прадмет на беларускай мове;

– акцэнтаваць увагу на ролі рэгіянальных дабрачынных бібліятэчных праграм і праектаў у развіцці і кансалідацыі грамадства;

– даць пэўную ўстаноўку на самастойную распрацоўку мерапрыемстваў з максімальным выкарыстаннем краязнаўчых матэрыялаў, якія дапамагаюць выхаванню патрыятызму, любові да Радзімы, глыбокай павагі да ўсіх нацый, што насяляюць Беларусь і садзейнічаюць яе росквіту.

Прафесія бібліятэкара – унікальная па сваёй сутнасці. Будучы бібліятэчны спецыяліст сёння з'яўляецца аб'ектам выхавання патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, а па заканчэнні універсітэта выступіць як суб'ект актыўнай выхаваўчай дзейнасці і будзе ўдзельнічаць у развіцці і ўдасканаленні нашага грамадства. Таму, выкарыстоўваючы змястоўны тэарэтычны матэрыял, лабараторныя і семінарскія заняткі, практыкумы па спецыяльных дысцыплінах, выкладчыкі засяроджваюць увагу на выхаванні ў студэнтаў патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці як важнейшага сродку раскрыцця творчых магчымасцей народа ў справе пабудовы свабоднага, дэмакратычнага і незалежнага грамадства.

---

1. *Лукашэнка А.Г.* О состоянии идеологической работы и мерах по её совершенствованию: доклад Президента Республики Беларусь на постоянно действующем семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов 27 марта 2003 г. // О состоянии идеологической работы и мерах по её совершенствованию: материалы постоянно действующего семинара руководящих



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работников республиканских и местных государственных органов. – Мн.: Академия управления при Президенте РБ, 2003.

2. *Мельник В.А.* Белорусская идея и национальная государственность. – Мн., 2003. – 140 с.

3. *Новая* философская энциклопедия. – М., 2001. – Т.2. – С.81.

4. *Харламов И.Ф.* Формирование личностных качеств в процессе воспитания // Педагогика. – 2003. – № 3. – С. 5 – 12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.М.Дубаўцова,** *ст.выкладчык*

## ТРАДЫЦЫЯ: КАТЭГАРЫЯЛЬНЫ СТАТУС І ВЫХАВАЎЧЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Сучасны стан распрацаванасці праблемы традыцыі як з'явы культуры сведчыць пра існаванне шматлікіх тэарэтычных і метадалагічных падыходаў да вывучэння дадзенага феномена. Першыя праявы цікавасці з боку вучоных да разумення азначанай праблемы датуюцца далёкім мінулым. А ў ХХ ст. да феномена традыцыі звярнуліся даследчыкі самых розных галін ведаў: філасофіі, культуралогіі, гісторыі, эстэтыкі, літаратуразнаўства, мовазнаўства, этнаграфіі, сацыялогіі, антрапалогіі і інш. Гэта сведчыць пра сацыякультурную значнасць і шматаспектнасць аб'екта даследавання.

Нягледзячы на цікавасць да традыцыі як феномена яшчэ ў другой палове мінулага стагоддзя з боку такіх вучоных, як Э.А.Балер, В.І.Брудны, П.П.Кампарс, Н.С.Сансербаеў, А.Г.Спіркін, Д.М.Угрыновіч, А.І.Зелянкоў і іншых, усё ж да нашага часу не распрацавана адзіная тэарэтыка-культуралагічная канцэпцыя яе зместу. А таму існуе патрэба ў разглядзе традыцыі як шматграннай з'явы культуры, якая патрабуе дадатковага аналізу. Разнастайнасць навукова-даследчых падыходаў і метадаў вырашэння дадзенай праблемы дазваляе пазбегнуць аднабако-